Год II — Аўторак, 7 лютага 1922 г. — № 24

РАНІЦА

штодзенная грамадзкая, палітычная і літэратурная газэта

АДРЭС РЭДАКЦЫІ і КАНТОРЫ:
Вільня, Афярная № 4, кв. 2.
Рэдакцыя адчынена што дня, апрача сьвят, ад 11 да 1. Адміністрацыя—ад 10 да 3.

Цана нумару 20 марак.
Падпіска на 1 мес. . . 400 марак.
З перасылкай на 1 „ . . 500 „
За граніцу ў два разы даражэй.

ЦАНА АБВЕСТАК:
За адзін радок звычайнага друку на 1 стр.—60 м.
ў тэксьце . . . . . . 75 м.
за тэкстам . . . . 40 м.
Для шукаючых працы на 10 проц. таней.

Вільня, 7 лютага 1922 г.

„Мір людзям добрай волі.“

Пад такім дэвізам зьбірае Валійскі чараўнік Лёйд Джордж конфэрэнцыю ў Гэнуі болей як 45 народаў.

Але, гаворачы гэтыя пекныя біблійныя словы, Лёйд Джордж забыўся, што страшэнная Эўрапейская бойня, якая каштавала болей 30 мільёнаў людзкіх афяр, ня прынясла абяцанага праз вусны Вільсона, вызваленьня народаў, іх вольнасьць і права на істнаваньне.

Бо вось цяпер, у тыя самыя дні, калі народы, бадай усяго сьвету, будуць радзіць у Гэнуі, як запраўды завясьці праўдзівы мір, мільёны беларускага народу стогнуць і будуць стагнаць у няволі Маскоўскага камунізму.

Пэўна-ж, Л.Джорджу, якому шмат часу трэба было на тое, каб пазнаць географію Польшчы і уразумець, што ёсьць такая самадзельная старана, ня можа прыйсьці ў галаву лёс Беларускага народу. Але на гэтай конфэрэнцыі будуць прадстаўлены нашы браты-палякі, якім добра ведамы каінскі акт Грабскага, дык няхай жа яны памятуюць і будуць сьвядомы ў свае адказнасьці за свае тамака выступленьня.

Яны павінны знаць, што запраўдны мір можа запанаваць на гэтым усходзе толькі тагды, калі запраўды вольнасьць народаў тут стане рэальным жыцьцёвым фактам, калі і мы, беларусы, зможам на вызваленай нашай зямлі сказаць сваё слова аб будучых лёсах нашага краю, якія мы, ў імя гістарычных і нацыянальных інтарэсаў, разумеем у лучнасьці з Рэчыпаспалітай Польскай.

Праўда, сьвядомасць беларускага народу яшчэ слабая, але рэжым катаў на той старане фронту яе падносіць, і, мусіць, недалёкі ўжо час, калі, праз вагэнь пажараў, ўсходняя Беларусь разплавіць кайданы няволі.

Сілай мілым ня будзеш.

Паміж дэкляарацыямі, зложанымі ў Віленскім Сойме, ў справе палітычна-дзяржаўнага быцьця нашага краю, спэцыяльную ўвагу звяртае дэкляарацыя групы „Адрджэньне“.

Спэцыяльную увагу звяртае не дзеля таго, што з'яўляецца ядынай дэкляарацыяй, якая зусім ясна стаіць на грунце незалежнага дзяржаўнага жыцьця нашага краю і ў канцы падкрэсьлівае фэдэрацыйную сувязь Віленска-Ковенскай дзяржавы з Польшчай, але дзеля таго, што гавора аб паразуменьні Сувэрэннага Віленскага Сойму з Соймам Ковенскім, пасьля вядомай ноты Ковенскага Ураду да Польшчы, ў каторай Ковенскі Урад катэгарычна заяўляе, што Віленскага Сойму ня прызнае ня толькі як сувэрэна, але ня прызнае наогул.

Праўда, ў ноце гэнай Ковенскі Урад гавора аб тым, што выбары ў Віленскі Сойм былі несвабоднымі, што народ да выбараў заганялі пагрозамі і г. д., так што маглоб здавацца, што пры іншых варунках, пры варунках поўнай гарантыі свабоды выбараў, Літоўскі Ковенскі Урад сувэрэннасьць Віленскага Сойму мог-бы прызнаць. Але гэта толькі так здаецца.

Хто, хаця трошкі, знаёмы з тымі асновамі, каторымі кіруецца Літоўскі Урад пры развязцы пытаньня аб Віленшчыне, таму ясна, што сувэрэнныя правы пад Віленшчынай ён прызнае толькі за сабою і побач с сабою другога сувэрэна ня сьцэрпіць.

Гэта ясна трэба сабе сказаць і як бы мы не хацелі засыпаць тую глыбокую прорву, якую выкапала паміж двома братнімі народамі—зямлі Ковенскай і Віленскай, злая воля ворагаў абодвых народаў, прорвы гэнай засыпаць ня будзе можна, пакуль Ковенскі Урад ня дойдзе з займаемага становішча Сувэрэна Віленшчыны, і ня прызнае ядыным сувэрэнам у развязцы Віленскага пытаньня, волю яго жыцялёў, якая ніколі не згодзіцца адрачыся ад дзяржаўнай сувязі з Польшчай у тэй ці іншай форме. Толькі пры такіх варунках дэкляарацыя п. С. Міцкевіча мела-б рэальны грунт, а цяпер выходзіць, што п. С. Міцкевіч сватаецца да Літоўскай дзяўчыны і мае надзею атрымаць яе згоду ня гледзячы на тое, што нядаўна сказала: „не прысылай сватоў, бо ня любы ты мне!“

Гэткая трываласьць у справах сэрца іншы раз дае пабеду, але ў справах палітычных з'яўляецца толькі нічым ня вытлумачаным оптымізмам.

ТЭЛЕГРАМЫ.

ВАШЫНГТОН 5. II. (A. W.) Апошняе паседжаньне конфэрэнцыі аб разаружэньні адбудзецца ў цанядзелак 6 гэтага лютага.

ПРАГА 5. II. (A. W.) У Чэхіі бастуе 35.000 гарнарабочых.

КАТАВІЦЫ 5. II. (A. W.) „Goniec Sląski“ падае падробнасьці аб зробленай коаліцыйнымі ўладамі рэвізыі ў Глівіцах. У Глівіцкай бойні знойдзена абмундзіраваньне і аружжа на 600 жаўнераў, 380 10-ці цэнтымэтравых артылерыйскіх снарадаў, а таксама колькідзесят снарадаў іншага калібру і 1600 ручных гранатаў.

У Козьлю выкрыты склад аружжа і абмундзіраваньня на 3000 жаўнераў, у Глагоўску мундураў на 5000 жаўнераў.

КАТАВІЦЫ 5. II. (A. W.) Катавіцкая „Gazeta Robotnicza“, абгаварываючы апошні нямецкі напад у Глівіцах і прыводзячы прыклады, ўзмагаючагася ў Раціборскім павеце руху баявых нямецкіх арганізацый выказвае апасеньня, што гэта проба новага нямецкага „putzchu“

КАТАВІЦЫ 5. II. (A. B.) Галоўная Рада P. P. S, адазвала сваіх прадстаўнікаў з Горна-Шлёнскае Рады. Прычыны адазваньня няведамы.

РЫМ 5. II. (A. B.) У суботу ў 11 гадзін 40 мін. паказалася трэцьця сфумата.

КАТАВІЦЫ 5. II. (A. B.) З ліку 20 французаў, раненых у часе апошняга нямецкага нападу на французскі аддзел у Глівіцах, у суботу памёрла двух.

РЫМ 5. II (A. B.) „Obserwatore de Roma“ засьцярагае газэты, каб не надавалі вестак аб Конклаве, прыпамінаючы, што рэгулямін Конклава вымагае утрымліваць ў сакрэце ход выбараў папы.

РЫМ 5. II. (A. B) Кароль прыняў віцэпрэзыдэнта Сэнату Мэлод'я, а так сама Кольдпа, а потым віцэ прэзыдэнтаў палаты дэпутатаў Біцьціо і Петравэля. У канцы кароль меў нараду з Джіолітті.

БЭРЛІН 6. II. (A. B.) Забаставалі работнікі газавага заводу і электрычнай станцыі. Рух па гарадзкіх калеях зусім спыніўся.

ГЛІВІЦЫ 6. II. (A. B.). У звязку з выкрыцьцем у Глівіцах тайных арсэналаў, стверджано, што агітацыя нямецкіх нацыяналістаў вялася праз камуністаў, падтрымоўваных з Бэрліна.

ХАРКАЎ 6. II. (A. B.). У транспартах Цэнтральнага Камітэту помачы галодным выкрыта 1580 кражаў. Дагэтуль арыштована западазроных у гэтым 500 асоб.

ХАРКАЎ 6. II. (A. B.). Чэхаславацкая місія збіраецца зрабіць тут выстаўку.

БЭРЛІН 6. II. (A. B.). Да жалезна-дарожнай забастоўкі далучыліся працаўнікі тэлеграфу.

БЭРЛІН 6.II. (A. B.). Урад ня выказвае гатоўнасьці вясьці перагавары з забастоўшчыкамі. Запасы вугля вышлі.

БЭРЛІН 6. II. (A. B). Соцыялістычныя і камуністычныя арганізацыі востра выступаюць проціў дэкрэту прэзыдэнта, а так сама, проціў паліцэйскіх правілаў. Сярод забаставаўшых пануе тэндэнцыя да аб'яўленьня генэральнай забастоўкі.

ХАРКАЎ 6. II. (A. B). Савецкая прэса непакоіцца аб конфэрэнцыі Румыніі з Югаславіяй. Весткі аб вайсковай Конвэнцыі Румыніі з Югаславіей і Румыніі з Турцыей уважаюць за варожы акт у адносінах да Савецкай Расеі.

З Віленскага Сойму.

Трэцьцяе чарговае паседжаньне Віленскага Сойму пайшло на складаньне прапазыцыяў розных Соймавых групаў, у справе далейшага палітычна-дзяржаўнага быцьця Сярэдняе Літвы.

Зусім зразумела, што развязка гэтага кардынальнага пытаньня, выклікае вялікую цікавасьць і пасьлы, а так сама і публіка, чакаюць адчыненьня паседжаньня ў пэўным паднесеным настроі.

Адчыніўшы паседжаньне, маршалак чытае прывітальныя тэлеграмы, прысланыя на імя Віленскага Сойму ад Начальніка Польскае дзяржавы Язэпа Пілсудзкага, ад маршалка Варшаўскага Сойму п. Тромпчынскага, ад рэктора Віл. унівэрсытэту — прафэсара Сядлецкага, ад Сэнату Віл. унівэрсытэту і г. д. Пасьля, адзін за адным, прадстаўнікі соймавых клюбаў чытаюць свае дэкляарацыі ў справе палітычна-дзяржаўнага быцьця краю. Першым чытае дэкляарацыю прадстаўнік блёку польскіх нацыянальных групаў, згуртаваных каля Н. Д. Далей прадстаўнік Радаў Людовых, пасьля яго п. Сьвяхоўскі ад імя П. С. Л. і клюбу дэмакратаў, затым дэлегат С. Міцкевіч ад імя клюбу Адраджэньня, дэлегат Заштофт ад імя клюбу П. П. С. і дэлегат Л. Хамінскі, ад імя клюбу Адраджэньня-Вызваленьня.

Усе дэкляарацыі, за выняткам дэкляарацыі п. С. Міцкевіча, каторая займае зусім асобную пазыцыю, можна падзяліць на дзьве групы. Адна група — блёку нацыянальных групаў і Радаў стаіць на пэўным злучэньні Віленшчыны з Польшчай (уцяленьне) і другая група ў каторую ўваходзяць дэкляарацыі ўсіх іншых клюбаў (за выняткам п. С. Міцкевіча) ў тэй ці іншай форме, падкрэсьліваюць патрэбнасьць аўтаноміі нашага краю. Як першая група так і другая прызнаюць за Польшчай сувэрэннае права да Віленшчыны і спыняюць усялякія трактаты і ўмовы, каторыя даюць якія небудзь правы да Віленшчыны іншым дзяржавам.

Постуляты гэтыя, ў дэкляарацыі Адраджэньня-Вызваленьня, зьвчаць гэтак: „Сойм залучае, што на векавечныя часы аб'яўляе свой родны край, усю Віленскую зямлю, за вольны і незалежны ад уселякага чужацкага гвалту і толькі волю яго жыцялёў прызнае за правамоцную пры выражэньні яго долі.

Віленскі Сойм, як выразіцель гэнае волі пастанаўляе:

1) Спыняецца на заўсягды чужацкае і ненавіснае панаваньне Расеі, накінутае збройнай сілай, і толькі на моцы гэтага права трываючага сто з лішкам гадоў, ня гледзючы на нашы паўстаньня і скінутае толькі дзякуючы адвазе. і афярам польскага жаўнера і крыві сыноў нашае зямлі,

2) На моцы ўсяго гэтага прэтэнсіі да Віленскай зямлі Расеі: царскай, бальшавіцкай, ці якой небудзь іншай, прызнаюцца ня важнымі на векавечныя часы, як адкінутыя воляй жыцялёў гэнае зямлі, каторыя ніколі не дапусьцяць павароту расейскага панаваньня, альбо ўмешываньня Расеі ў справы гэтага краю.

3) Дзеля гэтага не маюць значэньня уселякія абавязаньні і трактаткы, на моцы каторых даўней, цяперака, ці ў будучыне.—Расея важылася-б мешацца ў справы Віленшчыны, а асабліва, тра-

[illegible] усе [illegible]кую сілу трактат літоўска-[illegible]кі з дня 12 ліпня 1920 году, каторы процізаконна распараджаецца Віленскай зямлёй бяз веды і проці волі яе жыцялёў.

4) Як выражэньне нічым ня звязанай волі жыцялёў Віленскай зямлі, устанаўляецца на вечныя часы моцнае яе злучэньне пад адн[illegible] супольнай Суверэннай уладай з Р[illegible]спалітай Польскай, ад каторай толькі [illegible] нейкі час, гвалтам, сто гадоў таму назад, была яна адарвана, і з каторай, ад вякоў, ствара-ла адно цэлае".

Аб справе аўтаноміі дэклярацыя Адраджэньня—Вызваленьня гавора у п. 5 гэтак:

«Разумеючы, што Польшча, абымаючы ўсю поўнасьць сувэрэннай улады над Віленскай зямлёй, як гвкарантыя яе духоўнага і матэрыяльнага развіцьця і поўнага раўнапраўя ўсіх жыцялёў бяз рожніцы мовы і веры, дасьць ёй права ўнутраннага вырашэньня мяйсцовых справаў—аўтаномію, Сойм Віленскі выражае сваё пракананьне, што органамі гэнага самопраўленьня застануцца: Віленскі Сойм і адказны прад ім краёвы урад у Вільні, да кампэтэнцыі каторых будзе належаць, побач з кантролем адміністрацыі, так сама устава[illegible]аўства і вырашэньне ўселякіх мяйсцовых справаў у [illegible]ах мовы, духоўнага і матэрыяльнага жыцьця, а ў першую чаргу, правядзеньне зямельнай рэформы».

Пазыцыя, занятая п. Міцкевічам, радыкальна розніцца тым ад пазыцыі іншых соймовых клюбаў, што тагды, калі аўтанамісты так і ўцяленцы прызнаюць над Віленшчынай Сувэрэнную уладу Р. П Польскай—клюб „Адраджэньне" з п. Міцкевічам на чале, Сувэрэнам прызнае Віленскі Сойм, выбраны на аснове агульнага галасаваньня і далей тым, што моцна падкрэсьлівае блізкасьць, амаль ня еднасьць Віленскай зямлі з зямлёй Ковенскай, што ў дэклярацыі яго знайшло гэткую формуліроўку:

„Далейшую долю нашага краю мае права вырашыць Сувэрэнны Віленскі Сойм, выбраны па аснове агульнага галасаваньня народу.

На моцы гэнага, стоячы на стражы інтарэсаў усяго краю і ўсіх яго народаў і, бачучы вялікую небясьпеку для будучыны яго ў трываньні істнуючай нязгоды паміж дзьвюма яго часткамі—Зямлёй Віленскай і Ковенскай, і смуцячыся над варожымі адносінамі, якіе устанавіліся паміж дзьвюма калісь братнімі народамі, Польскім і Літоўскім, Віленскі Сойм кліча Сойм устававадаўчы Літоўскай Рэспублікі да паразуменьня і супольнага вырашэньня варункаў супольнага згоднага істнаваньня сыноў аднэй зямлі, і кліча Сойм устаўвадаўчы Р. П. Польскай да дапамогі сьвятой справе згоды і е[illegible]насьці ў сэнсе сучасных дэмакратычных ідэалаў і найлепшых традыцыяў [illegible]шлага, якое злучыла Польшу з [illegible] неразарвальнымі зьвязямі [illegible] дзяржаўнасьці ў прошлым і [illegible] у найбліжэйшай будучыне.

◆◆◆◆

Народная прасьвета у нас.

(Гл. № 23 „Раніцы").

Праз нейкі тыдзень я выехаў з вёскі С-ны; А было гэта у канцы лістапада. Наука у школе тады яшчэ не пачалася.

Якая далейшая доля школы ня ведаю. Аднак я пракананы, што школа пачала сваю працу, што мёрзнуць ў ёй дзеткі, мерзне і галадуе, як дагэтуль пан прафэсар за свае 5000 марак у месяц, а карысьці з гэнай школы дзеткі маюць ня балей, як пан прафэсар.

Гэны абразок узяты з жыцьця, ў ім німа прыкрасы. Дадаць толькі трэба, што гутарка тутака ідзе аб адчыненьні польскае школы, а не беларускай, адчыненьне каторых спатыкае яшчэ балей перашкод.

Ня ведаю, як Вас шаноўныя чытачы, але мяне, калі прыпамінаю сабе [illegible] гэнай сумнай гісторыі, ахоплівае жаль трывога. Шкада мне дзетак, працягваючых свае дробныя ручкі да праменьняў сьвету, шкада іх бацькоў, што, ня гледзячы на цемнату сваю, не затрымаліся перад матэрыяльнымі афярамі, каб даць дзеткам школу, і панясьлі у гмінную раду, праўда, праклінаючы і лаючыся (балей з прывычкі, чым са злосьці) грошы, якія Гмінная Рада запатрэбавала; шкада мне і Гміннай рады, якая ня гледзячы на сваю малаграматнасьць не паўстрымалася перад вызначэньнем падатку на справу школы, рызыкуючы сваей папулярнасьцю ў вёсцы.

Трывога мяне агортывае за долю нашае бацькаўшчыны, у каторай народ яшчэ доўгія годы ня выйдзець са стану безграматнасьці, калі справа асьветы будзе ісьці так, як дагэтуль. Бо ніхто мяне не праканае, што, ня гледзячы на усе цяжкія варункі, у якіх знаходзіцца народная прасьвета у нашым краю, у звязку з фінансавымі хлапотамі польскае дзяржавы, нехваткай пэдагагічнага пэрсаналу і г. д. ніхто, кажу, не праканае мяне, што можна спакойна пазіраць на факт, істнаваньня, хацяб у форме вынятку, такіх варункаў, пры каторых вёска наша пастаўлена перад альтэрнатывай ня мець зусім школы, альбо мець школу гэткую, якая найлепш характэрызуецца пэнсыей настаўніка у ліку 5000 марак у месяц.

Факт з гэтай школай велмі характэрны для справы народнай прасьветы дзеля таго, што гутарка тутака йдзе аб аснаўных элемэнтах асьветы народу, аб школе пачатковай, аб гэным зернятці, што толькі праз некалькі доўгіх гадоў узойдзе буйным коласам на нашай ніве, калі сёняшнія дзеткі скончаць яе, выра-стуць і, як паўнапраўныя грамадзяне, пазнаныя у школе праўды пачнуць застасоўваць у жыцьцё.

І калі гэныя зернята пры засеве сваім спатыкаюць гэткія перашкоды, то каліж нам чакаць у вёсках народных дамоў, лектараў і г. д. адным словам, народнай прасьветы ў поўным значэньні гетага слова?

Чакаць?

А ці можна адкладаць справу прасьветы народу ў нашым краі, маючы побач бальшавіцкую Расею, заснаваўшую сваё панаваньне на цемры сялянства і закідаючую усюды карэньні свае, дзе пануе царства цемнаты.

Ці можам мы адкладаць справу прасьветы у краі, зьнішчаным вайною, у краі курных хат і трохпалёвай гаспадаркі?

З гэным чакаць нельга! І цяпер, калі змоўклі адгалоскі вайны, і край наш пераходзіць у стан супакою і адбудовы справа прасьветы шырокіх масаў народу павінна заняць сваё пачэснае мейсца і ў поўным сваім значэньні стаць на парадак дня.

Дзеля спэцыяльных варункаў у нашым краі, долю яе павінны вырашыць ня людзі далёкія, чужыя, але людзі свае, грамадзяне гэнага краю. Яе павінен вырашыць Віленскі Сойм.

Пішучы наагул аб справе народнай прасьветы, мы верым, што вырашэньне яе ў поўным аб'еме праз Віл. Сойм вырашыць і справу беларускай школы згодна з інтэрэсамі беларускага народу.

С—с.

◆◆◆◆

Справа рээміграцыі.

Прадстаўнік Віленскай Агэнцыі прасовай атрымаў ад кіраўніка рээміграцыйнага Упраўленьня п. Сапегі інфармацыі аб дзейнасьці гэтай установы.

Да 1 студня г. г. рээміграцыйнае ўпраўленьне мела назову Камісар'яту Эміграцыйнага пры міністэрстве працы і апекі, якое знаходзілася ў Варшаве. З 1 студня гэтая установа была падпарадкавана Міністэрству Унутранных спраў. З гэтага моманту варункі жыцьця для рээмігрантаў былі палепшаны. Перш усяго, да гэтага ні ў адным з пакояў ня было сьвятла. Цяпер усюду праведзена электрыка. Папсутыя печы папраўлены, а там, дзе іх заўсім ня было —пастаўлены жалезныя. Фундамэнтальны рэмонт: устаўка шыбаў ужо заканчываецца.

Да гэтага часу уцякачы спалі на падлозе, цяпер яны сьпяць на тапчанах. У матэрыяле для апалу недастачы няма. Дзеля таго, каб апал будынку йшоў у шыбкім тэмпе, уцякачы самі топяць печы.

Што датычыцца харчаваньня ўцекачоў, дык яду даюць дарма на працягу 7—8 дзён пасля прыбыцьця, а ўдовы і сіраты адтрымліваюць яду і ўвесь час.

З кухні бежанцам выдаюць сьнеданьне, вячэру і паўфун. хлеба што дзень. Вячэру гатовяць з прадуктаў, якія афяраваў Польскі Белы Крыж.

Дзяцей-корміць Амэрыканскі Камітэт дапамогі дзецям, які мае пры інстытуцыі сваю ўласную кухню.

Вялікі крок наперад у барацьбе з эпідэміямі зрабіло стварэньне ізоляцыйных пакояў для хворых, абавязковая лазня і дэзынфэкцыя.

Гэтае ўсё дало ўжо добрыя рэзультаты. Напрыклад, прад 1-ым студня хворых што дзень было 12—13, а цяпер толькі 1—3, а часам і ні воднага. Выпадкі хваробы на тыфус бываюць толькі сярод недаўна прыбыўшых.

Санітарная дапамога так сама добра арганізована.

Як скончыцца рэмонт будзе адчынены прытулак для дзяцей — сіратаў. Тымчасам дзякуючы афярам і дапамозе некалькіх асобаў—дзеці адтрымліваюць адзежу і бялізну.

У апошні час адтрымліваюць з кухні харчы 230 асоб, а ўсіх уцекачоў у будынку ёсьць кали 300.

Сярод уцякачоў ёсьць і такія, якія знайшлі ўжо для сябе працу, але ня маюць яшчэ памяшканьня.

Адміністрацыйны пэрсанал зьменшаны на палову — засталося толькі 6 чалавек.

Навакола Сойму.

Зямельны закон.

Левая фракцыя Сойму мяркуе, што новы аграрны закон павінен перш усяго скараціць вялікую земляўласнасьць.

Ваенныя, а так сама, беззямельныя будуць надзеляны зямлёй у першую чаргу, а потым ужо і малазямельныя.

Левыя дэлегаты маюць надзею, што зямельная рэформа будзе прынята Соймам у самым нядоўгім часе.

Паездкі дэлегатаў.

Некатарыя дэлегаты прапануюць арганізаваць агульныя паездкі дэлегатаў у суседнія дзяржавы, каб пазнаёміцца з глаўнымі гарадамі Заходняй Эўропы.

Інцындэнт з ахранай.

Абвешчэньне выбараў старшыні Сойму дэлегаты спаткалі гучнымі воклясками, але гэта не спадабалася аднаму з сяброў соймавай ахраны і ён галосна заявіў дэлегатам, што Сойм не тэатр і калі хто будзе падаваць воклескі, дык таго вывядуць з салі...

Дэлегаты абразіліся і патрэбавалі звольніць грознага стражніка, што і было зараз жа зроблена.

Соймовая газэта.

У хуткім часе пачнецца выданьне спэцыяльных бюллэтэняў аб пасяджаньнях Сойму.

Да ўзварота г. Жэлігоўскага.

На адным з бліжэйшых паседжаньняў Сойму будзе ўнесена прапазыцыя аб узвароце у Вільню генэрала Жэлігоўскага.

Кажуць, што амаль ня ўсе дэлегаты жадаюць, каб генэрал Жэлігоўскі вярнуўся у Вільню як найхутчэй.

Раздзел у партыі „Адраджэньне".

На грунце глыбокай розніцы ў паглядах на справу палітычна-дзяржаўнай будучыны Сярэдняй Літвы, партыя „Адраджэньне" нядаўня раздзялілася на дзьве групы; раздзел гэты выказаўся і на соймовых кругох партыі, каторыя стварылі два клюбы: адзін з п. С. Міцкевічам на чале, затрымаў пры сабе клічку клюбу „Адраджэньне", другі на чале з п. Л. Хамінскім істнуе у Сойме падназваньнем клюбу «Адраджэньне—Вызваленьне».

◆◆◆

ХРОНІКА

Назначэньне п. Збароўскга.

Дэкрэтам Старшыні Часовай Урадуючай Камісыі ад 25 студня № 475 п. Маріян Збароўскі назначаны з 1 студня 1922 г. дырэктарам упраўленьня Соймавых Спраў.

Назначэньне п. Рачкевіча.

Ходзяць чуткі, што Навагрудзкі Ваевода п. Рачкевіч будзе назначаны дэлегатам Польскага Ураду ў Вільні.

Адбудова касьцелаў.

Часовая Урадовая Камісія зрабіла пастанову аб отпуску лесу на адбудаваньне касьцёлаў у Падбожа і Цвэрацку.

Парадак заканатворчасьці.

У хуткім часе, як кажуць, будзе апублікаваны дэкрэт Старшыні Часовай Урадуючай Камісіі аб заканатворчай інцыатыве і парадку апублікаваньня законаў.

Заканатворчая ініцыатыва, акрамя верхоўнаў улады будзе належаць да правадыра Час. Урад. Камісіі і дырэктароў дэпартамэнтаў.

◆◆◆◆

Беларускае жыцьцё.

Выдавецтва белар. падручнікаў.

Справа выдавецтва беларускіх школьных падручнікаў ужо аканчальна вырашана. Гэтымі днямі арганізуецца польска-беларуская камісія спэцыялістаў у склад якой уваходзяць тры прэдстаўнікі ад беларусаў з асьветнага адзелу пры Цэнтральным Камітэце Краёвай Сувязі. Камісія мае разгледзець і зацьвердзіць тыя падручнікі, якія будуць адпаведаць належным пэдагагічным вымаганьням. Пасьля гэтага, Выдавецкі Адзел Краёвай Сувязі, возьмецца да іх друкаваньня.

Першае беларускае навуковае мэдыцынскае выданьне.

Вядомы беларускі дзеяч доктар мэдыцыны А. Паўлекевіч апрацаваў твор аб барацьбе з малярыяй паводле зробленых ім адкрыцьцяў. Выданьне выйдзе ў сьвет перш-наперш на беларускай мове.

Цыкл лекцыяў аб беларускім нацыянальным адраджэньні.

Арганізацыйна-Палітычны Аддзел Цэнтральнага Камітэту Краёвай Сувязі рыхтуе цыкл папулярных лекцыяў аб гісторыі беларускага нацыанальнага адраджэньня і яго мэтах. З рэфэратамі маюць выступіць беларускія грамадзкія дзеячы п. п. Ф. Умястоўскі, В. Пупка, П. Аляксюк, д-р А. Паўлюкевіч і інш. У першую чаргу лекцыі будуць прачытаны ў Вілейцы, Радашковічах, Баранавічах, Несьвіжы, Лувінцы і Навагрудку.

Зварот амэрыканскіх беларусаў

Цэнтральны Камітэт Краёвай Сувязі атрымаў ліст ад амэрыканскіх беларусаў на чале з п. Гаспарам Цыбульскім, паходзячым з Ашмяншчыны. Амэрыканскія беларусы просяць Краёвую Сувязь прыслаць ім свой статут, газэты і адказаць на некатарыя пытаньня ў беларускіх справах.

Новае выданьне аб жыдоўскім пытаньні на Беларусі.

Сэкрэтар мінскай сыяністычнай партыі студэнт Пражскага унівэрсытэту п. Каган выдаў сваю навуковую працу, ў якой вельмі дэтальна і абаснована характарызуе становішча і гістарычную прошласьць жыдоў на Беларусі, даючы ня мала мейсца і беларускаму нацыянальнаму руху.

п. Варонка ізноў актыўны палітык.

Дзякуючы апошнім стараньням заўсягды спрытнага п. Цьвікевіча, дайшло да поўнай угоды паміж п. Варонкай і п. Ластоўскім, на моцы чаго п. Ластоўскі прызначыў рэдактару „Вольнае Літвы" п. Варонка мейсца заступніка Старшыні Рады Міністраў.

Рэдактар-Выдавец: Вацлаў Адамовіч.

Друкарня „Друк" Субач 2.